*Л.К.Кухто*

# МОДУЛЬНА-РЭЙТЫНГАВАЯ СІСТЭМА АЦЭНКІ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Праблема ацэнкі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў набывае асаблівую актуальнасць і значнасць у перыяд рэфармавання сістэмы адукацыі. Сучасныя тэндэнцыі ў развіцці вышэйшай школы прадугледжваюць актывізацыю самастойнай работы, сістэматычнае і ўдумлівае вывучэнне прадмета, дыферэнцыраванне і ранжыраванне студэнтаў па ўзроўні ведаў. У апошнія гады вызначыўся шлях, які дазваляе актывізаваць вучэбна-пазнавальную дзейнасць студэнтаў. Гэта так званая рэйтынгавая сістэма ацэнкі ведаў.

Увядзенне сістэмы абумоўлена імкненнем да глыбокай і гнуткай методыкі ацэньвання. Дадзеная сістэма дазваляе ацаніць не толькі веды студэнтаў, але і ўзровень іх мыслення, развіцця творчых здольнасцей, ступень разумення і культуру выяўлення ведаў. Рэйтынгавая сістэма дае магчымасць паглыблена падысці да ацэнкі прафесійнага, навукова-даследчага і творчага патэнцыялу студэнтаў. Названая сістэма ацэнкі работы ўсё больш становіцца сродкам кантролю вучэбнай дзейнасці, незалежна ад статуса вывучаемай дысцыпліны (сацыяльна-гуманітарнага, акульнапрафесійнага, спецыяльнага блокаў ці дысцыплін спецыялізацыі), формы экзамену (вусны, пісьмовы ці тэсціраванне). З дапамогай гэтай сістэмы можна кантраляваць выкананне адукацыйных стандартаў па пэўнай спецыялізацыі.

Вопыт выкарыстання рэйтынгавай ацэнкі работы студэнтаў сведчыць, што яе эфектыўнасць немагчыма без укаранення ў навучальны працэс новых педагагічных тэхналогій, у прыватнасці модульнай сістэмы. Што ўяўляюць вучэбна-метадычныя комплексы, пабудаваныя па модульным прынцыпе? Паспрабуем іх разгледзець на прыкладзе вучэбнага курса “Народы свету”. Увесь курс, які разлічаны на 70 гадзін,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падзяляецца на шэраг буйных блокаў (модуляў), кожны з якіх утрымлівае завершаныя раздзелы вывучаемага курса. Модуль складаецца з лекцыйнага матэрыялу, тэм і пытанняў семінарскіх заняткаў з указаннем літаратурных крыніц, дакументаў і матэрыялаў, якія патрэбна вывучыць студэнтам самастойна пры падрыхтоўцы да іх.

Вывучэнне кожнага модуля заканчваецца абаронай, за якую выстаўляецца пэўная колькасць балаў (ад 10 да 30 у залежнасці ад значнасці модуля).

Кожны модуль уключае таксама сістэму тэстаў, пытанні і заданні для самакантролю і кантролю ведаў. На працягу семестра студэнту прапануюцца для самастойнага вывучэння дзве тэмы, за кожную з якіх ён можа максімальна атрымаць 10 балаў. Так, на падставе атрыманых ведаў можна напісаць эсэ па адной з самастойна вывучаемых праблем аб'ёмам 2–3 старонкі. У якасці самастойнай работы практыкуюцца падрыхтоўка дакладаў і іх абмеркаванне на семінарскіх занятках, напісанне рэфератаў з папярэднімі індывідуальнымі кансультацыямі па іх. За самастойную работу студэнту налічваецца ад 1 да 10 балаў у залежнасці ад якасці яе выканання.

Па кожным модулі намі праводзіцца выніковае тэсціраванне, а па некаторых – прамежкавы пісьмовы залік. Калі па курсе "Народы свету" прадугледжваюцца 6 модуляў, то максімальная колькасць балаў, якую можа набраць студэнт за ўсе прамежкавыя тэсты і залікі, складае 60. За прамежкавыя залікі і тэсты па вучэбнай дысцыпліне неабходна атрымаць не менш 42 балаў (70%), каб яны былі залічаны як выніковыя семестравыя ацэнкі. Вызначэнне ацэнкі ажыццяўляецца наступным чынам: 42–46 балаў – ацэнка 6, 47–50 – ацэнка 7, 51–54 – ацэнка 8, 55–59 – ацэнка 9, 60 балаў – ацэнка 10, але пры ўмове, калі не было 1 ці 2 балаў за прамежкавае тэсціраванне і залік.

Студэнты, якія атрымалі на семінарскіх занятках або за розныя віды самастойнай работы 1–2 балы, а таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прапусцілі тэсціраванне і модульны залік, абавязаны здаць іх на працягу двух тыдняў. Гэта з'яўляецца ўмовай допуску да здачы выніковага семестравага заліку (экзамену).

Назіранні за работай студэнтаў па модульна-рэйтынгавай сістэме паказваюць, што яна вымагае сістэматычнай работы (у тым ліку і перш за ўсё самастойнай). Разглядаемая сістэма ацэнкі вучэбнай дзейнасці прымушае студэнтаў рэгулярна рыхтавацца да заняткаў, выконваць усе віды прапанаваных формаў самастойнай работы. Ужо ў ходзе засваення зместу першага модуля выразна бачна дыферэнцыяцыя студэнтаў на здольных, старанных, працалюбівых і нядбайных, якія спадзяюцца на тое, што можна будзе абысці прамежкавы кантроль.

Каб гэтага не адбылося, на першай лекцыі па вучэбнай дысцыпліне мы знаёмім студэнтаў з умовамі модульна-рэйтынгавай сістэмы, якія застаюцца нязменнымі на працягу семестра. Яны ўключаюць:

– агульную колькасць модуляў і канкрэтны іх змест;

– вучэбна-метадычную літаратуру;

– сістэму ацэнкі работы студэнтаў на семінарскіх занятках і за выкананне канкрэтных формаў самастойнай работы;

– парадак, тэрміны правядзення тэсціравання і прынцыпы яго ацэнкі;

– тэрміны выканання кожнага модуля і прамежкавага заліку;

– парадак вызвалення студэнтаў ад выніковага семестравага заліку па выніках модульнай сістэмы.

Наш вопыт выкарыстання модульна-рэйтынгавай сістэмы сведчыць аб тым, што пры належнай яе арганізацыі, кантролі самастойнай работы яна эфектыўная, дапамагае студэнтам атрымаць трывалыя веды ў працэсе навучання.

---

*Батура М.П., Некрасова М.С., Смирнова Г.Ф.* Рейтинговая система как стимул повышения эффективности учебной,

внеучебной деятельности // Адукацыя і выхаванне. – 1999. – № 9.– С.63–65.

*Масло И.М., Гридюшко А.И., Сафанков Е.И.* Автоматизированная модульно-рейтинговая система контроля учебной деятельности студентов // Вышэйшая школа. – 2004.– № 2. – С.29–32.

*Моисеев Ю.* Использование рейтинговой системы в профессиональной подготовке // Высшее образование в России. – 1998.– № 2.– С.96–98.

*Симонов В.П.* Педагогический менеджмент: 50 НОУ-ХАУ в области управления образовательным процессом: Учеб. пособие. – М.: Роспедагенство, 1997. – 26 с.

*Ю.У.Акуліч*

## АБ ВЫКАРЫСТАННІ РЭЙТЫНГАВАЙ СІСТЭМЫ Ў БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЙ АДУКАЦЫІ

На працягу 2000–2004 гг. намі праводзілася даследаванне на 5-м курсе факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў. У ім прынялі ўдзел 94% навучэнцаў. Выбар студэнтаў 5-га курса ў якасці рэспандэнтаў быў абумоўлены тым, што, з аднаго боку, гэта ўжо амаль гатовыя спецыялісты, а з другога боку, як студэнты яны добра ведаюць навучальны працэс.

Адказы рэспандэнтаў пацвердзілі нашу гіпотэзу аб тым, што на факультэце недастаткова выкарыстоўваюцца індывідуалізацыя навучання і метады, якія актывізуюць здольнасці і схільнасці, творчы патэнцыял асобы [1].

Даследаванне паказвае, што пры выкарыстанні методыкі рэйтынгавай сістэмы ацэнкі ўзроўню падрыхтоўкі студэнтаў значна ўзрастае роля індывідуалізацыі навучання, таму што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ